Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

# Беларускі ўніверсітэт

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 5 (696) ● ПЯТНІЦА, 9 ЛЮТАГА 1968 г. ● Цана 2 кап. Год выдання XXI

**Адпачынак закончыўся. З новымі сіламі за вучобу!**

## Рэспубліканская нарада па пытаннях развіцця і выкладання грамадскіх навук



# КОМПАС НАШАГА РУХУ

У той час, калі студэнты стацыянара адпачывалі на канікулах, у нашым універсітэце адбываліся важныя падзеі. На працягу трох дзён (30 студзеня — 1 лютага) у актавай зале галоўнага корпуса праходзіла рэспубліканская нарада супрацоўнікаў навуковых устаноў і выкладчыкаў грамадскіх навук вышэйшых навучальных устаноў, скліканая ЦК КПБ. У нарадзе прынялі ўдзел кандыдат у члены Палітбюро ЦК КПСС, першы сакратар ЦК Кампартыі Беларусі П. М. Машэраў, Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР С. О. Прытыцкі, Старшыня Савета Міністраў Ц. Я. Кісялёў, сакратар ЦК КПБ Ф. А. Сурганаў, першы сакратар ЦК ЛКСМБ Г. М. Жабіцкі, намеснік загадчыка аддзела навукі і навучальных устаноў ЦК КПСС М. П. Кавалёў, адказныя работнікі ЦК КПСС Ю. Г. Турышчаў і С. І. Дарафееў, загадчыкі аддзелаў ЦК КПБ М. Ф. Капіч, А. Т. Кузьмін, С. В.



Марцэлеў, намеснік міністра вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі Н. С. Ягораў, начальнік Упраўлення выкладання грамадскіх навук гэтага міністэрства С. І. Мурашоў, а таксама група вядучых вучоных грамадствазнаўцаў — дырэктар Інстытута прыродазнаўства і тэхнікі Акадэміі навук СССР, акадэмік Б. М. Кедраў, намеснік дырэктара Інстытута марксізма-ленінізма пры ЦК КПСС член-карэспандэнт АН СССР Д. М. Кукін і іншыя. У зале сабраліся работнікі навуковых устаноў, выкладчыкі грамадскіх навук вну, кіраўнікі раду міністэрстваў і ведамстваў, сакратары і загадчыкі аддзелаў абкомаў партыі, сакратары ЦК і абкомаў камсамола, прадстаўнікі друку, радыё і тэлебачання Беларусі.

Прысутныя ўшанавалі мінутай маўчання памяць Міхаіла Васільевіча Дарашэвіча — міністра вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР, кандыдата ў члены ЦК КП Беларусі, дэпутата Вярхоўнага Савета БССР, прафесара, заслужанага дзеяча навукі і тэхнікі БССР, які памёр пасля працяглай і цяжкай хваробы.

Уступнай прамовай нараду адкрыў кандыдат у члены Палітбюро ЦК КПСС, першы сакратар ЦК КП Беларусі П. М. Машэраў. З дакладам аб задачах навуковых і навучальных устаноў рэспублікі ў святле пастановы ЦК КПСС «Аб мерах па далейшаму развіццю грамадскіх навук і павышэнню іх ролі ў камуністычным будаўніцтве» выступіў сакратар ЦК КПБ С. А. Пілатовіч.

На пленарным пасяджэнні у абмеркаванні даклада прынялі ўдзел 21 чалавек, звыш 20 прамоўцаў падрабязна опыніліся на ўзнятых пытаннях даклада С. А. Пілатовіча на пасяджэннях секцый гісторыі і гісторыі КПСС, (кіраўнік— доктар філасофскіх навук, загадчык кафедры гісторыі КПСС гуманітарных факультэтаў БДУ У. М. Сікорскі), філасофіі (член-карэспандэнт АН БССР, загадчык кафедры марксісцка-ленінскай філасофіі БДУ В. І. Сцяпанаў), палітэканоміі (загадчык кафедры палітэканоміі Беларускага палітэхнічнага інстытута, кандыдат эканамічных навук З. З. Дудзіч), навуковага камунізма (загадчык кафедры навуковага камунізма БДУ, кандыдат гістарычных навук М. Р. Круцько).

Дакладчык і выступіўшыя ў спрэчках прамоўцы падвялі вынікі выканання пастановы ЦК КПСС, падрабязна тварылі аб развіцці грамадскіх навук у рэспубліцы і стане іх выкладання ў вышэйшых навучальных установах, аб недахопах, якія маюць месца ў гэтай вялікай і важнай справе і шляхах іх пераадолення. На ўсіх секцыях адбыўся шырокі і карысны абмен вопытам навуковай, навукова-метадычнай і выхаваўчай работы. Асобна гутарка ішла аб выкладанні грамадскіх навук па новых праграмах.

На заключным пленарным пасяджэнні былі заслуханы паведамленні кіраўнікоў секцый, а з заключным словам выступіў сакратар ЦК КПБ С. А. Пілатовіч.

Удзельнікі нарады праслухалі лекцыі акадэміка АН СССР Б. М. Кедрава— «Сучасная навукова-тэхнічная рэвалюцыя і сацыяльны прагрэс», загадчыка сектара Інстытута філасофіі АН БССР, доктара філасофскіх навук Е. Д. Мадржынскай — «Крытыка асноўных напрамкаў сучаснай буржуазнай фальсіфікацыі марксізма» і адказнага работніка міжнароднага аддзела ЦК КПСС С. І. Дарафеева — «Сусветны камуністычны рух на сучасным этапе».

Ад універсітэта на нарадзе выступіў прафесар І. М. Лушчыцкі. Ён расказаў аб рабоце, якая вядзецца ў рэспубліцы ў галіне сацыялагічных даследаванняў. У Беларусі створан інстытут сацыялагічных даследаванняў, выдадзены новыя работы, рад матэрыялаў падрыхтаван і выдадзен непасрэдна ва ўніверсітэце; нядаўна тут створана праблемная сацыялагічная лабараторыя. Аднак сацыялагічныя даследаванні ўсё ж адстаюць ад патрабаванняў, якія ставіць Цэнтральны Камітэт КПСС. Прамоўца гаварыў далей аб даследчай рабоце, якая праводзіцца ў рэспубліцы ў галіне гісторыі філасофіі. Ужо напісаны дысертацыі па філасофіі дакастрычніцкага перыяду. Цяпер некалькі маладых вучоных працуюць над пытаннямі савецкай марксісцка-ленінскай філасофіі. Прарэктар С. А. Умрэйка спыніўся на супрацоўніцтве выкладчыкаў грамадскіх навук універсітэта ў навуковых даследаваннях. У прыватнасці, ён паведаміў, што супрацоўнікі кафедраў грамадскіх навук універсітэта ўзялі абавязацельствы да стагоддзя з дня нараджэння У. І. Леніна напісаць работу «У. І. Ленін аб выхаванні чалавека камуністычнага грамадства». Прафесары У. М. Сікорскі і В. І. Сцяпанаў выступілі на секцыях з дакладамі аб выкладанні гісторыі КПСС і філасофіі па новых праграмах.

**На здымках:** Уступнай прамовай нараду адкрывае кандыдат у члены Палітбюро ЦК КПСС, першы сакратар ЦК Кампартыі Беларусі П. М. Машэраў (уверсе); з дакладам выступае сакратар ЦК КПБ С. А. Пілатовіч (злева); у зале пасяджэнняў (унізе).

Фота Д. ПРЭСА.



## НАПЯРЭДАДНІ самастойнасці

**Нялёгкі хлеб у журналіста-газетчыка, нават калі ты яшчэ і не маеш свайго месца ў аддзеле і не займаеш пасады, нават калі ты не больш і не менш як практыкант. Да цябе прыглядаюцца пільна, насцярожана, ад цябе чакаюць у гэты час незвычайных адкрыццяў. Ва ўсякім выпадку, нарыс твой павінен быць не горш, чым у Таццяны Тэс, а фотаэцюдам ты моцна бахнеш па славе Васіля Пяскова. Пакуль жа гэтага не здарылася, бяры аловак у зубы і шыбуй хоць на край свету, лезь са скуры, але даручэнне рэдакцыі выканай. Памятай, ты павінен друкавацца.**

**З самага ранку носяцца па рэдакцыях, пераскокваюць з трамвая на тралейбус, імчацца паяздамі да жаданага аб'екта студэнты-практыканты IV курса факультэта журналістыкі. Некаторыя насядаюць на старога сябра — на тэлефон.**

**— Ало! Ало! — пяты раз падымае трубку Аляксандр Табачнікаў.— Гэта біястанцыя? Біястанцыя гэта? Ало!**

**Яму нарэшце адказваюць, што гэта біястанцыя Чырвонае Урочышча. Саша пераможным позіркам акідвае пакой, падміргвае: маўляў, Саша ў газеце, як рыба ў вадзе.**

**— Цікавыя вопыты ёсць? — смела ідзе ён у наступленне на далёкага субяседніка.**

**У трубцы некаторы час маўчаць, затым даносіцца няўпэўненае «а?»**

**— Чым займаецеся, пытаю.**

**— Вартаўніком я тут.**

**Саша моўчкі адыходзіць ад тэлефона: біястанцыя не падае надзеі.**

**Але гэтая няўдача не збівае хлопца з тропу. Як ні кажы, а тры матэрыялы ў яго ўжо ёсць, і ў «Вячэрнім Мінску» яго ўжо крыху ведаюць. Праўда, іншыя таксама не дрэмлюць. Вунь і Гарбачоў у «Советской Белоруссии» выступіў, і Вялічка — у «Звяздзе», і Марціновіч хваліўся, што «Чырвонку» заваліў рэцэнзіямі. Рыгор Кадзет — лепшы сябра — першым надрукаваў свае здымкі ў газеце «Знамя юности». Але што яму да іх, яшчэ падумаюць, што ён, Табачнікаў, зайздросціць. Пабачым, хто будзе хваліцца ў канцы лютага.**

**Вядома, практыка ў рэспубліканскіх газетах і на радыё — не мёд: трэба ва ўсіх жанрах выступіць, паказаць сябе ў масавай рабоце, падзяжурыць, зрабіць макет. Але дапамагаюць веды, набытыя за чатыры гады вучобы, дапамагаюць кіраўнікі практыкі, вопытныя журналісты з рэдакцый. Ды і самі хлопцы ведалі, куды паступалі, на лёгкі хлеб не разлічвалі, з нецярпеннем чакалі час, калі давядзецца сваімі рукамі рабіць газету. Няхай гэта цяжка, але які гонар — рабіць газету!**

**Сённяшнія студэнты будуць верна служыць сваёй справе ў будучым. У гэтым упэўнены і іх настаўнікі і яны самі. Зараз, напярэдадні самастойнасці, яны даказваюць гэта сваёй стараннасцю.**

**П. ПАБОКА,**
**студэнт журфака.**

НА ГЭТЫМ ТЫДНІ ПРАЗВІНЕЎ ЗВАНОК, ЯКІ АБВЯСЦІЎ АБ ПАЧАТКУ ДРУГОГА СЕМЕСТРА. ЯКІЯ ВЫНІКІ МІНУЛАЙ СЕСІІ, ЯК АДПАЧЫВАЛІ СТУДЭНТЫ Ў ЧАС КАНІКУЛ — АБ ГЭТЫМ МЫ РАСКАЗВАЕМ У НІЖЭЙ ЗМЕШЧАНЫХ МАТЭРЫЯЛАХ.

# ДРУГІ СЕМЕСТР ПАЧАЎ СВАЁ ШЭСЦЕ



*На здымку: выкладчык гісторыі КПСС Г. Е. Марціновіч і загадчык кафедры гісторыі КПСС прыродазнаўчых факультэтаў дацэнт Т. І. Прытыцкая ў час экзамена на другім курсе хімічнага факультэта. Адказвае В. Брылей. У яго залікоўцы з'явіцца яшчэ адна выдатная адзнака.*

Фота І. АСКІРКІ.

## ІНТЭРВ'Ю З ВЫДАТНІКАМІ

**Трэцюю сесію здалі на выдатна студэнты другога курса філалагічнага факультэта Анатоль Бруцкі, Віктар Дарашкевіч, Таня Пшыркова, Валя Позняк і іншыя...**

**Да вышэй пералічаных студэнтаў я звярнуўся з пытаннямі:**

**— Што такое выдатнік! Як вы разумееце гэта! Ці можа быць пры жаданні выдатнікам кожны студэнт!**

**Першым адказаў наш філосаф (так называюць яго на курсе) ТОЛЯ БРУЦКІ:**

**— ...Інтэлект лічу прыроджаным здабыткам, таму не адзначаю віны таго, хто не вылучаецца яго бліскучасцю.**

**Эрудыцыя —здабытак інтэлекту на аснове абагульнення вядомых фактаў, устанаўлення лагічнай сувязі ў ланцугу фактаў. Даю даному сцвярджэнню паэтычны аргумент: просты камень, як ты яго ні шліфуй, не засвеціць гамай фарбаў, алмаз жа патрабуе лёгкай апрацоўкі, каб заззяць непаўторна. Вывад: інтэлект ад прыроды, і каб ён даў поспех, трэба арыентаваць яго ў пэўным кірунку — і вы здзівіцеся яго магутнасці. Пасрэдны розум не дасць практычных вынікаў пры самай нават тытанічнай працы над ім. Выдатнікам (я маю на ўвазе сапраўдным) не можа быць кожны.**

**А вось што гаворыць па гэтаму пытанню ВІКТАР ДАРАШКЕВІЧ:**

**— Пазнанне ісціны і філасофіі зямнога жыцця штурхае чалавека да ведаў, да светлых аўдыторый і бібліятэк. Мне здаецца, гэта характэрная з'ява нашай сучаснасці. Інтэлектуальнасць студэнта лічу адносна (праўда, не кожнага), б адзін адчувае сябе лебедзем на строгай хвалі матэматыкі, другі ў грамадскіх навуках.**

**Філолагі — работнікі ідэалагічнага фронту. Таму важна (а гэта падкрэсліваў яшчэ Макаранка) цікавіцца не толькі праграмным матэрыялам, але і геаграфіяй, тэатрам і... матэматыкай. Іменна апошняй. Дакладная навука вучыць мысліць, развіваць сваю думку паслядоўна, г. зн. логіцы. Але чаму атрымліваецца так, што пры аднолькавай падрыхтоўцы вынікі бываюць розныя! Я думаю, тут адчувальна школьная аснова ведаў. Штурмаўшчына, на мой погляд, толькі адмоўна ўплывае на поспех экзамена.**

**На канкрэтнае пытанне, ці кожны студэнт можа быць выдатнікам, адказаць пакуль што ўстрымліваюся.**

**Прыкладна такой жа думкі і ЮРА НАГОРНЫ:**

**— У асноўным падтрымліваю Дарашкевіча. Чалавек не нараджаецца разумным. Веды прыходзяць з развіццём чалавека. Мне здаецца, трэба больш чытаць, працаваць над сабою, быць зацікаўленым у тым, што робіш. Адказваючы Бруцкаму, магу сказаць, што любы алмаз таксама патрэбна адтачыць, каб заззяў. А адточаны камень быў прыладай працы першабытнага чалавека. Вялікі талент — рэдкі дар прыроды, але не развіўшы яго, нічога не выйдзе. Я думаю, выдатнікам можа стаць кожны.**

**Больш проста на даныя пытанні адказалі ТАНЯ ПШЫРКОВА і ВАЛЯ ПОЗНЯК:**

**— У першую чаргу патрэбна наведваць лекцыі, пастаянна рыхтавацца да практычных, больш працаваць над сабой, і поспех прыйдзе сам. Жыццё дае чалавеку столькі, колькі ён укладае ў яго.**

**С. БАЛОТКІН.**

*АД РЭДАКЦЫІ: Друкуючы гэты матэрыял, рэдакцыя газеты запрашае адгукнуцца на пастаўленыя ў ім пытанні, выказаць думку, хто ў вашым уяўленні сапраўдны выдатнік вучобы, раскажыце аб ім.*

## ТВОРЧАЕ ЗАСВАЕННЕ НАВУКІ— АБАВЯЗАК КОЖНАГА

Новы навучальны год універсітэт пачаў у знамянальныя дні, калі наша краіна рыхтавалася дастойна сустрэць вялікае свята—паўвяковы юбілей Кастрычніка.

У год слаўнага юбілею ва універсітэце быў адкрыты новы факультэт — журналістыкі. Падрыхтоўка кадраў вышэйшай кваліфікацыі вядзецца цяпер больш чым па 40 спецыялізацыях. Выконваючы дырэктывы XXIII з'езда КПСС, універсітэт упэўнена нарошчвае тэмпы свайго развіцця. У цяперашнім навучальным годзе на першыя курсы было прынята 3344 чалавекі, у тым ліку на дзённае аддзяленне — 1911. Агульны лік студэнтаў у пачатку навучальнага года склаў 14,5 тысячы.

Партыя паставіла перад вышэйшай школай ясную і пэўную задачу — павысіць якасць падрыхтоўкі спецыялістаў. З першых жа дзён навучальнага года намаганні дэканатаў, кафедр і навукова-педагагічных работнікаў былі накіраваны на выкананне гэтай галоўнай задачы.

Якія ж вынікі вучэбнай і выхаваўчай работы ва універсітэце за бягучае паўгоддзе, як студэнты і выкладчыкі справіліся з пастаўленай задачай?

Аб гэтым гавораць вынікі зімовай экзаменацыйнай сесіі. З агульнай колькасці студэнтаў, якія павінны былі здаваць экзамены, 84,2 працэнта паспяхова здалі экзамены па ўсіх прадметах вучэбнага плана, а 15,8 працэнта атрымалі нездавальняючыя адзнакі або, адчуваючы сваю слабую падрыхтоўку, не з'явіліся на экзамены. Лік студэнтаў, атрымаўшых выдатныя і добрыя адзнакі на экзаменах, складае 46,6 працэнта.

Сярод атрымаўшых нездавальняючыя адзнакі (886) у большасці студэнты першых і другіх курсаў — 72 працэнты. У асноўным матэматычнага (каля 30 працэнтаў), хімічнага — 14, фізічнага — 13, біялагічнага — 10, філалагічнага (каля 10 працэнтаў).

Ці могуць задаволіць нас такія вынікі? Вядома, не.

Якія вывады можна зрабіць па выніках сесіі?

Па-першае, ацэнка ведаў студэнтаў праводзілася ва ўмовах далейшага павышэння патрабавальнасці: гэта станоўчая з'ява, бо задача універсітэта—рыхтаваць высокакваліфікаваных спецыялістаў.

Павышэнне патрабавальнасці з'яўляецца магутным стымулам да сістэматычнай, сур'ёзнай самастойнай работы студэнтаў, для больш глыбокага, творчага засваення навукі.

Па-другое, многія студэнты мала працуюць самастойна над кнігай.

Па-трэцяе, некаторыя выкладчыкі недастаткова з'дзяйсняюць кантроль за самастойнай працай студэнтаў на працягу семестра шляхам правядзення індывідуальных кансультацый, калоквіумаў. Яны яшчэ не здолелі адказацца ад безасабістага, «валавага» падыходу да студэнтаў.

А якасць падрыхтоўкі спецыялістаў у многім залежыць ад арганізацыі сістэматычнага кантролю за паспяховасцю студэнта. Пад ім трэба разумець сістэму мер, якія дазваляюць ацаніць веды на працягу ўсяго навучальнага года і ўсяго перыяду навучання. Да гэтых мер адносіцца строгі, планамерны кантроль за самастойнай работай студэнтаў у лабараторыях і на семінарах, за ходам працы над курсавымі работамі і г. д. На многіх факультэтах усё яшчэ слаба выкарыстоўваюцца тэхнічныя сродкі навучання, вучэбнае кіно.

Варта таксама адзначыць, што камітэт камсамола і прафком слаба наладжваюць масавы ўдзел студэнтаў у паляпшэнні навучальнай працы — работу вучэбных камісій на курсах, факультэтах, агульнаўніверсітэцкія конкурсы на лепшую групу, грамадскую атэстацыю студэнтаў. Такія меры, безумоўна, садзейнічалі б павышэнню паспяховасці.

Цяпер нашай задачай з'яўляецца барацьба з двоечнікамі, павышэнне ліку студэнтаў, якія паспяваюць на «выдатна» і «добра». Шляхі дасягнення гэтай мэты мы бачым у далейшым развіцці ініцыятывы студэнцкіх арганізацый у вучэбна-выхаваўчай рабоце.

Нам здаецца, што некаторым кафедрам прыродазнаўчых навук неабходна пераняць вопыт работы кафедраў грамадскіх дысцыплін, дзе выкладчыкі з года ў год удасканальваюць методыку выкладання грамадскіх дысцыплін у суадносінах з профілем факультэтаў, звязваючы тэарэтычны матэрыял з практыкай.

Характэрна, што за апошнія гады значна павялічыўся інтарэс студэнтаў да вывучаемых грамадскіх навук, педагогікі і псіхалогіі. З 7673 студэнтаў, якія здавалі экзамены па грамадскіх дысцыплінах у зімовую сесію, атрымалі нездавальняючыя адзнакі толькі 167 чалавек.

Бліжэйшымі надзённымі задачамі з'яўляюцца: самы дакладны аналіз і абагульненне сесіі па кожнай дысцыпліне, на кожнай кафедры і на факультэце, далейшае павышэнне якасці лекцый, выкарыстанне ўсіх магчымасцей для ўмацнення самастойнай працы студэнтаў, шырокае прыцягненне да навукова-даследчай работы, умацаванне дысцыпліны студэнтаў, у першую чаргу, абавязковае наведванне ўсіх заняткаў — недысцыплінаванасць непазбежна прыводзіць да нізкай паспяховасці. Да гультаёў трэба ўжываць сур'ёзныя меры, ставіць пад жорсткую крытыку нядбайных у вучобе і шырока папулярызаваць лепшых студэнтаў і выкладчыкаў па кіраўніцтву самастойнай працай, высокую дысцыпліну і паспяховасць.

**В. ДАЛГАРУКАЎ,**
**начальнік вучэбнай часткі.**

## «В'ЕТНАМ ЗМАГАЕЦЦА»

**Для юнакоў і дзяўчат, якія прыехалі з розных краін і навучаюцца ў БДУ, БПІ і іншых вну, назаўсёды запамятаецца вечар «В'етнам змагаецца», што адбыўся ў Палацы культуры камвольнага камбіната.**

**Прэзідэнт зямляцтва в'етнамскіх навучэнцаў студэнт фізфака БДУ імя У. І. Леніна Ву Зуй Фу расказаў прысутным аб новых актах агрэсіі амерыканскіх імперыялістаў у ДРВ, аб вялікіх поспехах байцоў НФВПВ. Бурнай авацыяй сустрэлі ўсе паведамленне, што ў Сайгоне байцамі народнай арміі быў захоплен будынак пасольства ЗША, вызвален і ўтрымліваецца горад Гуэ — старажытная сталіца В'етнама.**

**— Жорсткія баі ідуць і ў іншых раёнах Паўднёвага В'етнама, — гаворыць Ву Зуй Фу. — Блізка той час, калі з амерыканскімі імперыялістамі і іх марыянеткамі будзе пакончана... Мы ўпэўнены ў гэтым, бо з намі вялікі Савецкі Саюз, усе сацыялістычныя краіны, усе людзі добрай волі...**

**Маладыя рабочыя камбіната, камсамольскія актывісты горада горача віншавалі в'етнамскіх сяброў з поспехамі іх суайчыннікаў на фронце і з наступіўшым Новым годам па Лунному календару.**

**Вечар закончыўся вялікім канцэртам, у якім прынялі ўдзел артысты беларускай філармоніі, в'етнамскага цырку і калектыў мастацкай самадзейнасці падрыхтоўчага факультэта універсітэта.**

**М. ПІЛІПЧЫК.**

## У МУЗЕІ ЯКУБА КОЛАСА

Студэнты падрыхтоўчага факультэта ў час канікул наведалі літаратурныя музеі АН БССР Я. Купалы і Я. Коласа. У музеі Я. Коласа яны сустрэліся з сынам паэта Данілам Канстанцінавічам Міцкевічам, які зараз працуе дырэктарам гэтага музея. Пасля задушэўнай гутаркі Даніла Канстанцінавіч падарыў замежным сябрам невялікі альбом «Па залах літаратурнага музея Я. Коласа», зрабіўшы на адной з яго старонак уласны надпіс.

А ў кнізе наведвальнікаў з'явіўся такі надпіс: «Мы ўдзячны, што мелі магчымасць наведаць музей Якуба Коласа, дзе пазнаёміліся з жыццём, літаратурнай і грамадскай дзейнасцю вялікага паэта беларускага народа».

**К. САВІН.**

## ГОСЦІ— ЗЕМЛЯКІ

*На падрыхтоўчым факультэце нядаўна быў арганізаваны культпаход у в'етнамскі цырк. Больш 100 в'етнамскіх студэнтаў з захапленнем глядзелі выступленні сваіх землякоў-артыстаў, майстроў в'етнамскага цырку.*

## НЕ ТОЛЬКІ ДЛЯ ЗАЛІКУ

**Незадаволенасць вынікамі працы прымушае мяне сказаць некалькі слоў аб вывучэнні замежных моў.**

Гаворачы пра аб'ектыўныя прычыны, якія перашкаджаюць авалоданню замежнай мовай, многія спасылаюцца на вучэбны план (300 гадзін на шэсць семестраў). Я не магу назваць гэтую прычыну абсалютна аб'ектыўнай, хоць абедзвюма рукамі галасую за штодзённыя аўдыторныя заняткі. На самай справе, хіба ёсць фатальная непазбежнасць у тым, што студэнт (ды і не толькі студэнт) не займаецца сёння тым, што патрэбна на паслязаўтра? Стратэгія вывучэння замежнай мовы патрабуе простай, але не ўсімі ацэненай тактыкі: працаваць без канікул рознай працягласці, пасля якіх звычайна нічога не застаецца ад набытага за семестр.

Выказаўшы гэтую банальную ісціну, можна было б і закончыць свае «некалькі слоў». Але, прыведзеныя да заблуджэння многімі завельмі ўзнёслымі артыкуламі з газет і часопісаў, студэнты пытаюць, чаму мы не працуем па «цуда-метадах», аб якіх пішуць? Гэта неабходна вытлумачыць.

На сягонняшні дзень методыка выкладання замежных моў дасягнула значных поспехаў у негалоўным, але важным напрамку: у трэніровачных практыкаваннях. Аднак методыка не дае адказу, як, абапіраючыся на засваенне на першай стадыі, падыйсці да другой, галоўнай,— да непадрыхтаванай (спантаннай, экспромтнай мовы). І наўрад ці атрымаем мы адказ на гэта ў бліжэйшым будучым. На практыцы большасць выкладчыкаў вымушана падыходзіць да «граматычнага метаду» (перакладу з роднай на замежную мову), хаця ён адхіляецца сучаснай методыкай. Сітуацыя такая, што разрушальная работа зроблена, а ўзамен дадзены толькі разрозненыя, супярэчныя рэкамендацыі. Так што, «цуда-метады» носяць у асноўным рэкламны характар.

Чытач мае права пачуць і аб маім метадычным крэда. Сёння яго магу сфармуляваць так: свядома ідучы на стылістычную штучнасць, вучыцца гаварыць проста аб простым і складаным, навучыўшыся гэтаму, можна ў далейшым дазваляць сабе большае.

У заключэнне вяртаюся да загалоўка: у ідэале на занятках па замежнай мове ў вну павінна быць не чыстае навучанне, а карэктыроўка самастойнай работы студэнта, у гэтым выпадку залік будзе не самамэтай, а лагічным завяршэннем работы для сябе.

Б. БАРКОЎСКІ,
загадчык кафедры нямецкай мовы.

На трасах адпачынку

◆

# КАРПАЦКАЯ РАПСОДЫЯ

Дваццаць чацвёртага студзеня ў 18,40 ад Мінскага вакзала адышоў лыжны турысцкі поезд «Беларусь». Пракладваць лыжню на горных адгор'ях Карпат адправіліся ў ім каля 400 аматараў горна-лыжнага спорта — у асноўным студэнты і супрацоўнікі вышэйшых навучальных устаноў рэспублікі, работнікі АН БССР, буйнейшых прамысловых прадпрыемстваў. Былі сярод іх і прадстаўнікі універсітэта, якія атрымалі пуцёўкі ў мясцкоме і прафкоме БДУ. Тры прадстаўнікі універсітэта — В. Баркан, А. Гусакоў і В. Хрэнаў — былі зацверджаны Белсаветам па турызму адпаведна на пасады старшага інструктара і інструктараў поезда.

За дзевяць дзён цікавага падарожжа беларускія турысты пабывалі ў самых маляўнічых мясцінах Карпат — у Ярэмчы, Варохце, Рахаве, Ясінях. Яны здзейснілі аднадзённыя паходы на вяршыны Шчыўкі, Каўпака, гары Лысай. Многія з іх паспрабавалі свае сілы на складаных сламомных трасах, спусках, азнаёміліся з трасамі, на якіх праходзілі адборачныя спаборніцтвы савецкіх лыжнікаў-алімпійцаў, назіралі паядынкі па скачках з трампліна на першынство ЦС «Авангард».

124 зломаныя лыжы — гэтая лічба сведчыць аб тым, што пакараць вяршыны не так і проста. Разам з тым не трэба кідацца ў крайнасці. Частыя паломкі — не толькі вынік недастатковай кваліфікацыі спартсменаў, але і няўмення правільна падбіраць снаражэнне. У гарах на звычайных гоначных лыжах, а іх узяла большасць удзельнікаў паездкі, далёка не паедзеш — патрэбны шырокія лыжы тыпа «турысцкіх» са спецыяльнымі крапленнямі. Гэта неабходна ўлічыць на будучае, тады менш будзе вымушаных прастояў і незаўсёды прыемных прызямленняў на вядомы «пяты пункт».

Як бачыце, у паездцы мы атрымалі карысны ўрок. Ну, і, канешне, самыя незабыўныя ўражанні аставілі самі Карпаты — дзівосная, маляўнічая прырода, срэбнае горнае паветра, цікавыя сустрэчы ў паходах і на базах з турыстамі. Сярод апошніх, на нашу радасць, аказаліся студэнты фізфака БДУ А. Іваністаў, Г. Шульговіч і іншыя, якія прыехалі самастойнай групай.

Цудоўны вірус горнай хваробы пранік у нашы сэрцы. Цяпер ужо не толькі як словы песні, але і як асвядомленую ўпэўненасць, паўтараем мы ўслед за Высоцкім:

«Лучше гор могут быть
только горы,
На которых никто не
бывал».

Агульны настрой верна выказаў самадзейны паэт у гімне нашага поезда:

«Прощайте пока,
ребята,
Увидимся с вами снова,
Ведь мы в Карпаты,
опять в Карпаты
Уйдем из дома
родного».

Карпаты чакаюць вас, непаседы і энтузіясты турызма. Да новых сустрэч у паяздах, на лыжні, на сцежках, ля кастроў!

**В. БАРКАН,**
ст. інструктар турпоезда, кандыдат гістарычных навук.

# ЛЯСНАЯ ТРАГЕДЫЯ



*На ўскрайку леса, пад маладой бярозкай, аблюбаваў вожык купіну малінніка. Восенню выграб пад ёй зямлю, нанасіў сухога лісця, прыдбаў недзе кусочак старой газеты. Хатка атрымалася наславу. Пасяліўся ў ёй. Начамі выходзіў паляваць на мышэй, а днём спакойна драмаў.*

*Заскрыпелі першыя маразы. Выпаў снег. Назапашанымі лісткамі замураваў вожык уваход у сваю хатку і згарнуўся ў клубочак. Трэба было перачакаць доўгую халодную зіму. Мялі завеі, белым пушыстым дыванам ахуталі зямлю, а разам з ёй і нашага вожыка. У хатцы было цёпла і ўтульна.*

*Ішла аднойчы галодная ліса. Пад бярозкай спынілася: пачула пах жывой істоты. Палязеў у бакі пашматанай коўдрай снег. Час ад часу ліса прыкладвала да зямлі вострую мордачку, нюхала, і яшчэ далей ляцеў з-пад яе лапаў снег, а затым і лісты. Здабыча была ўжо зусім блізка. Раптам ліса напружана адскочыла ўбок, зафыркала, аблізваючы языком сваю паколатую мордачку. Навастрыла вушы. Зноў асцярожна, аглядаючыся, падыйшла да гнязда, дзе прытаіўся незвычайны звярок. Пачуцці хітруні разгараліся. Выкаціла лапай здабычу з гнязда і паспрабавала ўхапіць зубамі... Ад моцнага болю ткнула морду ў снег. З асцярогай пазіраючы, абыйшла вакол вожыка, перавярнула. Усюды тырчэлі калючкі, клубочак быў непрыступным.*

*Доўга яшчэ танцавала ліса вакол вожыка. Вытоптвала снег, калола лапы, але так і не расквітаўшыся са сваёй ахвярай, пайшла далей правяраць снежныя норы.*

*А ззаду, на снезе, ля маладой бярозкі, стаўся ляжаць адубелы вожык — след нядаўняй лясной трагедыі.*

*С. СУПРУН.*

*Фота аўтара.*

КРЫТЫКА І БІБЛІЯГРАФІЯ

# «У РЭДАКЦЫЮ НЕ ВЯРНУЎСЯ...»

Прайшло тры гады з тых пор, калі чытачы пазнаёміліся з першай кнігай «У рэдакцыю не вярнуўся...» За гэты час работа калектыва франтавых газетчыкаў, прысвечаная памяці загінуўшых таварышаў, значна пасунулася наперад. Сёння чытачы могуць пазнаёміцца з другой кнігай «У рэдакцыю не вярнуўся...», у якой расказваецца аб жыцці, франтавой рабоце і смерці яшчэ дзевяноста дзевяці нашых таварышаў па пяру.

Для нас, журналістаў, студэнтаў і выкладчыкаў універсітэта кніга прадстаўляе асаблівую цікавасць. Адным з дзевяноста дзевяці герояў з'яўляецца былы наш студэнт Герой Савецкага Саюза Уладзімір Амельянюк. Аб ім расказаў дацэнт факультэта журналістыкі Марк Саламонавіч Зярніцкі.

Рэдактар падпольнай газеты Уладзімір Амельянюк быў студэнтам камуністычнага інстытута журналістыкі імя С. М. Кірава. Аўтар артыкула, у той час дырэктар і выкладчык КІЖа, добра ведаў Амельянюка. Апошні раз яны сустрэліся ў Беластоку, у рэдакцыі абласной газеты, дзе Уладзімір праходзіў вытворчую практыку.

Так ужо сталася, што Уладзімір і свой смяротны час сустрэў ля сцен роднага вну.

— Гэта адбылося 26 мая 1942 года ў Мінску, — піша ў сваіх успамінах М. С. Зярніцкі, — у раёне універсітэцкага гарадка. Заўважыўшы слежку, рэдактар (У. Амельянюк быў рэдактарам падпольнай газеты «Звязда» ў акупіраваным Мінску. — А. Я.) сціснуў у кішэні пісталет, спрабаваў заманіць сышчыка ў месца, зручнае для сутычкі. Але фашысцкі агент апярэдзіў яго. Высцралам у спіну Уладзімір Сцяпанавіч Амельянюк быў забіты.

Вайна ішла на захад. Франтавыя дарогі не раз закідалі армейскіх карэспандэнтаў на беларускую зямлю. Тут загінула слаўная дачка балгарскага народа, карэспандэнт «Камсамольскай праўды» Лілія Карастаянава. Магіла яе знаходзіцца ў Чачэрску на Гомельшчыне. Прайшоў з баямі Беларусь і загінуў на зямлі братняй Літвы ваенны журналіст Леанід Ганчароў, ваявалі ў Беларусі і загінулі смерцю герояў ваенныя карэспандэнты газеты «За Радзіму» 251-ай Віцебскай ордэна Чырвонага Сцяга і ордэна Суворава II ступені стралковай дывізіі Георгій Ушакоў, Барыс Пяшкоў і Юрый Сяўрук, загінуў пасланец ЦК камсамола Беларусі клічаўскі камсамолец, партызанскі сабкор, а пасля ваенны журналіст Міхаіл Белабароды. Каля сцен Сталінграда загінулі баявыя таварышы: намеснік рэдактара батальённы камісар Мікалай Бачароў і журналіст-пісьменнік, у мінулым супрацоўнік «Известий Витебского губсовета» Міхаіл Васільевіч Лузгін.

Іх шмат. Розных узростаў, розных характараў. Мужных і гераічных.

Адны былі вядомымі, іншыя толькі пачыналі свой літаратурны шлях. Іх літаратурную спадчыну — тонкія кніжачкі вершаў, апавяданняў і нарысаў, песень і пісьмаў выдавалі ў свет ужо пасля іх смерці блізкія і больш далёкія таварышы. Многіх, як нашага земляка-магілёўчаніна Марка Гейзеля, Варвару Наумаву, Івана Фёдарава, Барыса Кастрова прымалі ў Саюз савецкіх пісьменнікаў ужо пасля смерці.

«Другая кніга «У рэдакцыю не вярнуўся...» не мае права стаць апошняй», — піша ў сваёй прадмове К. Сіманаў. — Не сказана яшчэ многае і аб многіх. Наперадзе шмат работы».

**А. ЯРОХІН.**

Напружанай была першая студэнцкая сесія. Вельмі баяўся, каб не заваліць, не пасароміць родных. Нарэшце, залікі і экзамены здадзены — я еду дамоў!

Мабыць, кожны ганарыцца роднымі мясцінамі.

Цікавая і багатая гісторыя і майго роднага Люсіна-Цельшына. У 1902 годзе тут, у былой палескай глушы, пачынаў свой настаўніцкі шлях Якуб Колас.

# РАДАСЦЬ СУСТРЭЧЫ

У 1919 годзе мужыкі вёскі выступілі атрадам супроць белапалякаў і тры месяцы трымалі абарону ў сваіх руках. Я з хваляваннем прайшоў па гэтых мясцінах, да Цяляшова дуба, Шведавай гары, Татаркі — Цны, у Дзедаў вугал, на Буян, Баравы — тут некалі хадзіў малады Якуб Колас і шукаў сваю сцежку да мары.

Цяпер Якуб Колас не пазнаў бы Люсіна. Вёска намнога вырасла, лепшым стала жыццё. Хаты калгаснікаў электрыфікаваны. Гараць лямпачкі Ільіча і агенькі тэлевізараў. Іх у вёсцы ўжо каля трыццаці. Праз сяло, ля чыгункі, пралягла новая дарога. З Лунінца і Мінска ідуць аўтобусы. Асушаюцца і люсінскія балоты. Вякамі тут прэла багна, цвіў мох, а хутка зацвіце, забуяе пшаніца. Рыгор Занька, старшыня сельсавета, расказваў, што, калі меліяратары вялі ўзрыўныя работы, у хатах і на ферме павыляталі многія шыбы, і ніхто не сварыўся.

У цэнтры Люсіна ўстаў манумент славы тым, хто аддаў жыццё за лепшае будучае.

Калгас адпусціў сродкі на будаўніцтва ў вёсцы новага клуба і быткамбіната, ужо складзен праект, і летам распачнуцца работы.

Хутка праляцелі дні канікулаў. Зноў засталіся далёка крыніцы, старая ліпа, вязы, дарагія сэрцу месцы Люсіна. Зноў за вучобу! Але я яшчэ не раз прыеду да цябе, маё роднае Люсіна!

**М. БАБОК,**
студэнт I курса журфака.

СПОРТ

# РЭКОРДНЫ ЛІК КАМАНД

**Кафедра фізвыхавання і спорта і мясцком універсітэта пачалі праводзіць II спартакіяду мясцкома па дзевяці відах спорта: валейболу, баскетболу, настольнаму тэнісу, шахматах, шашках, стральбе, рыбнай лоўлі, лыжах, падняццю цяжкасцей. У спартакіядзе ўдзельнічаюць супрацоўнікі і выкладчыкі ўсіх факультэтаў, таксама кафедра фізвыхавання і вылічальны цэнтр.**

**Пачалася спартакіяда 25 студзеня гульнёй у валейбол. У гэтым спаборніцтве прыняў удзел рэкордны лік каманд: дзевяць у мужчын і чатыры ў жанчын.**

**Паза конкурсам, у выніку добрай падрыхтоўкі, былі валейбалісты фізфака на чале з аспірантам Ільюшчанка. Усе гульні яны праводзілі са значнай перавагай і перамогі атрымлівалі з аднолькавым лікам — 2:0.**

**Арганізавана і зладжана ігралі матэматыкі, сярод якіх асабліва вызначаліся ветэраны каманды І. А. Сакалоў і А. Ф. Наумовіч. Другое месца з'явілася заслужанай узнагародай для гэтай каманды. Наступныя месцы занялі каманды біяфака, гістфака, кафедры фізвыхавання, геафака, вылічальнага цэнтра, юрфака, хімфака.**

**Вельмі цікавая сітуацыя склалася ў жаночых камандах. Тры з іх — геафака, біяфака і вылічальнага цэнтра — набралі аднолькавую колькасць ачкоў — 2. Суадносіны выйграных і праіграных партый таксама аказаліся аднолькавымі. Для вылучэння лідэра прышлося лічыць ачкі ва ўсіх выйграных партыях. Гэты паказчык вывеў на першае месца дружную каманду біяфака, другімі былі географы, трэцімі — вылічальнікі. Мінулагодні пераможца I спартакіяды мясцкома (каманда матфака) завяршыў табліцу розыгрыша.**

**Прайшоўшыя гульні выявілі вялікую колькасць супрацоўнікаў, якія жадаюць займацца валейболам. Відавочна, пара выдзеліць час у спартыўных залах для трэніровак факультэцкіх каманд супрацоўнікаў і выкладчыкаў.**

**В. СОБАЛЕВА,**
**выкладчык кафедры фізвыхавання і спорта.**





*Святлана Дубоўская — актыўная ўдзельніца мастацкай самадзейнасці. Некалькі гадоў запар яна выступае на універсітэцкай сцэне.*

*На здымках: С. Дубоўская чытае ўрыўкі з «Прыгод Бураціна».*
*Фота І. АСКІРКІ.*



*Заснежаны парк.*

Рэдактар М. І. ІОСЬКА.

Зак. 234. АТ 02057 Наш адрас: Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, п. 106. Тэлефон Б-2-07-19. Друкарня выдавецтва «Звязда».